# «Для адстойвання інтарэсаў Айчыны...»

## Невядомы дакумент 1918 года па гісторыі беларускай дзяржаўнасці



Віталь СКАЛАБАН,
кандыдат
гістарычных навук

**Дакумент з трохі дзіўнаватым на сённяшні погляд загалоўкам «Пратакол надзвычайнай нарады актыўных беларусаў гор. Масквы 9 верасня 1918 года», што прапануецца ўвазе чытачоў, цікавы ў шмат якіх адносінах. Ён зберагаецца ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі сярод матэрыялаў Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей (Наркамнац) РСФСР, але даследчыкамі не выкарыстоўваўся.**

Гэта машынапіс на 14 старонках, подпісы старшыні і сакратара адсутнічаюць, але затое ёсць паметкі невядомай асобы, хутчэй за ўсё, адказнага супрацоўніка Наркамнаца, які вельмі ўважліва аналізаваў дакумент. Як пратакол трапіў у Наркамнац – невядома, ніякіх «суправаджальных» матэрыялаў няма. Старшынстваваў на нарадзе Язэп Канчар[1], які прыехаў з Петраграда і, мабыць, ініцыяваў скліканне гэтай нарады*. Язэп Канчар меў значны вопыт арганізацыйнай работы ў кааператыўным руху. Гісторык А.П. Карэлін называе яго прозвішча сярод выдатных кааператыўных дзеячаў (гл.: Корелин А.П. Кооперация и кооперативное движение в России. 1860–1917 гг. М., 2009. С. 268).

На нарадзе прысутнічалі Зміцер Жылуновіч[2], Іван Пятровіч (пісьменнік Янка Нёманскі)[3], Аляксандр Чарвякоў[4], Аляксандр Усціловіч[5], Іосіф Лагун[6], Ігнат Мазур[7]. Іх біяграфіі сёння ўжо добра вядомыя. Не даследаваны жыццяпісы супрацоўнікаў Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама, Белнакама), што бралі ўдзел у нарадзе: Фёдара Яхімовіча[8] (загадчык бежанскага аддзела Белнацкама, пазней – прафесар Мінскага медыцынскага інстытута), Пятра Клыша[9] (працаваў у агітацыйна-палітычным аддзеле, у 1919 годзе расстраляны палякамі ў Беластоку), Сямёна Русака[10] (сакратар выдавецкага аддзела), Івана Блізнюка[11] (загадчык канцылярыі, у 1920-я гады кіраваў справаводствам у НКУС БССР), Мікалая Семяновіча[12] (кіраваў Белнацкамам пасля А. Чарвякова, пазней выкладаў у Маскоўскім універсітэце). Пры абмеркаванні пытанняў актыўна выступаў Фёдар Турук[13], але сярод прысутных яго прозвішча чамусьці адсутнічае. Дакумент значна ўдакладняе нашы ўяўленні пра вядомую спробу Белнацкама дамагчыся на 3-м з'ездзе Саветаў Заходняй вобласці ў Смаленску перайменавання вобласці ў Беларускую. Насуперак гэтай прапанове з'езд надаў вобласці назву Заходняя Камуна.

Тэкст дакумента падаецца паводле сучаснай арфаграфіі на мове арыгінала.

У падрыхтоўцы матэрыялу да друку ўдзельнічалі супрацоўнікі аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Я.М. Блажэй, Н.Я. Калеснік, М.Я. Тумаш.

* Пра Я. Канчара як палітыка, гісторыка і мемуарыста гл. нашу публікацыю і фрагменты з яго працы «З гісторыі Грамадзянскай вайны ў Беларусі ў 1917–1920 гг.» у «Беларускай думцы» № 1–2 за 2010 год.

### ПРА АЎТАРА

СКАЛАБАН Віталь Уладзіміравіч.

Нарадзіўся ў 1947 годзе ў в. Шылавічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1970 годзе скончыў гістарычны факультэт Ленінградскага ўніверсітэта. У 1972–1995 гадах працаваў у выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя». З 1995 года – у Беларускім НДІ дакументазнаўства і архіўнай справы, у 2000–2002 – у Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Ф. Скарыны, з 2002 года – у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, загадчык аддзела публікацыі дакументаў.

Кандыдат гістарычных навук (1987).

Аўтар шматлікіх публікацый па гісторыі Беларусі XIX–XX стагоддзяў, кнігі «Время и бремя архивов и имен» (2009, разам з Л. Рублеўскай), складальнік зборнікаў дакументаў і архіўных даведнікаў, сааўтар сцэнарыяў дакументальна-мастацкіх фільмаў, п'ес.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускага нацыянальнага руху, пытанні архівазнаўства, краязнаўства і бібліяграфіі.

## Протокол чрезвычайного совещания активных белорусов г. Москвы 9 сентября 1918 г.

Присутствовали: Жилунович, Канчер, Петрович, Червяков, Устилович, Лагун, Мазур, Яхимович, Клыш, Русак, Близнюк и Семенович.

Председательствует Канчер.

Порядок дня. Обсуждение и постановления.

1. Отношение к Облискомзапу[14].

Для доклада предоставлено слово тов. Червякову: «10 сентября состоится съезд Советов Западной области, на котором будет разрешаться вопрос о том, быть ли Облискомзапу. **По отношению к Комиссариату Облискомзап всегда служил тормозом**[I], мешая работе из боязни того, что ему нужно будет занять определенную позицию при разрешении национального вопроса в Белоруссии. Нам нужно решить вопрос, как относится Белорусский Комиссариат к дальнейшему существованию Облискомзапа и как установить деловой контакт между Комиссариатом и Облискомзапом. Для разрешения этого вопроса нужно апеллировать к съезду Советов Западной области, для чего Комиссариат обязан делегировать своих представителей на съезд, которые обязаны добиться, чтобы в порядок дня был поставлен вопрос о взаимоотношениях между Комиссариатом и Облискомзапом».

Председательствующий предлагает присутствующим высказаться по докладу.

По этому вопросу высказываются следующие товарищи.

Тов. Петрович. Для отстаивания интересов **Белоруссии, как национально-территориальной единицы**[II], необходимо существование **краевой власти, которая только одна имеет право представлять интересы белорусских трудовых масс**[III] при разрешении различных вопросов в связи с выполнением Брестского мирного договора, с возвращением беженцев, с культурно-просветительной работой в оккупированной области. Таким образом, **Облискомзап**, как краевая власть, **должен существовать, но состав его, безусловно, должен быть изменен**[IV], т.к. члены Облискомзапа – люди случайные в Белоруссии и потому не могут выполнить той громадной работы, которая на них возложена.

Тов. Лагун. В настоящее время в настроениях членов Облискомзапа замечается резкий перелом в сторону благожелательного отношения к Белорусскому Комиссариату и к тем белорусам, которые группируются вокруг Комиссариата. При последнем посещении Облискомзапа один из его членов предложил даже дать работников для работы в Смоленске.

Тов. Жилунович. Облискомзап – вечное недоразумение для Белоруссии. Бороться с ним мы не можем, но и считаться с ним не должны. **Комиссариат является представителем белорусских масс при Совете Народных Комиссаров**,[V] и он вправе и должен посылать своих представителей для отстаивания интересов Белоруссии не считаясь с мнениями и желаниями Облискомзапа. Ожидать того, что Облискомзап примет определенную и при этом благожелательную позицию при **разрешении национального вопроса**[VI] в Белоруссии, нам не приходится, потому что отношение центрального правительства к национальному вопросу тоже неопределенно.

Тов. Червяков. Нельзя говорить о борьбе с Облискомзапом, т.к. члены его не являются нашими врагами, а лишь случайными людьми в Белоруссии, которые не могут выполнить взятой ими на себя работы вследствие незнакомства их с местными условиями и бытом белорусов. Мы должны говорить не о борьбе, а о нашей работе в Белоруссии. Мы должны решить вопрос, **ограничить ли нам свою работу той канцелярщиной, какой является по существу работа в Комиссариате, или мы должны перенести свою работу в Белоруссию, для чего делегаты от Комиссариата на съезде должны потребовать, чтобы в состав Облискомзапа вошли кандидаты, выставленные Комиссариатом**[VII].

В то же время Комиссариат не только не должен сокращать свою работу, но наоборот, постепенно расширять ее, **чтобы в конце концов стать официальным представителем при Совете Народных Комиссаров всей Белоруссии**[VIII].



Аляксандр Чарвякоў

Тов. Мазур. Напрасно сгущены краски у тов. Жилуновича, т.к. отношение Совета Народных Комиссаров к национальному вопросу давно уже определилось, и это подтвердилось в последнее время декретом о созыве «Войскового круга»[15].

Тов. Близнюк. Положение Белоруссии вообще и беженцев в частности как в Советской России, так еще более в оккупированной части, ужасное. Всеми ясно чувствуется, что нет у белоруса его защитника перед властями. Облискомзап отмахивается от такой защиты и отсылает к Комиссариату, а Комиссариат ничего не может сделать, т.к. всякая попытка Комиссариата в большинстве случаев оканчивается ничем за отсутствием необходимых прав у Комиссариата. Нужно больше ясности при взаимоотношениях между Комиссариатом и Облискомзапом.

Тов. Жилунович. Мы ничего не можем сделать, т.к. достаточно нам перенести Комиссариат, как таковой, в Белоруссию и начать активную работу среди белорусов, как на нас посыплются обвинения в соглашательстве с Радой[16]. Никто не поверит нашей искренности, а также тому, что мы стоим на платформе советской власти. Перенесением своей работы в Белоруссию мы только вызовем сильнейшую агитацию против себя, т.к. никто из нынешних членов Облискомзапа не пожелает, чтобы на территории Белоруссии работали белорусы. Поэтому я нахожу гораздо целесообразнее оставаться в центре, где нас признают как белорусов и считаются с нами как с белорусами.

Тов. Канчер. Тов. Жилунович, очевидно, разделяет точку зрения своих ближайших людей по «Громаде», считая более целесообразным сидеть в канцелярии и мечтать о будущей судьбе Белоруссии. Платонически вздыхать о судьбе

I Падкрэслена сінім алоўкам.
II Падкрэслена чырвоным алоўкам. Насупраць – у дужках клічнік.
III Падкрэслена сінім алоўкам.
IV Падкрэслена сінім алоўкам.
V Падкрэслена сінім алоўкам. Насупраць – у дужках пытальнік.
VI Падкрэслена сінім алоўкам. Насупраць – у дужках пытальнік.
VII Падкрэслена сінім алоўкам. Насупраць – у дужках пытальнік і памета: Взгляд на работу К[омисса]риата.
VIII Падкрэслена сінім алоўкам.

белорусов, не видя белорусов. **Задача Комиссариата заключается в том, чтобы вызвать естественную смерть Облискомзапа**[IX]. Комиссариат должен открыть свои отделы во всех городах, где живут белорусы. Эти отделы должны, постепенно расширяя сферы своей компетенции, вытеснить налетный элемент Белоруссии, вследствие чего Облискомзап должен будет все более считаться с белорусами Петербурга и Москвы, а затем и окончательно передать всю власть в Белоруссии белорусам. Нельзя говорить о переносе Комиссариата в Белоруссию и об уничтожении работы Комиссариата, т.к. слишком огромна эта работа. Мы должны перенести не Комиссариат, а свою работу в самую толщу белорусских трудовых масс. Несомненно, в Белоруссии будут считаться с белорусами, ставленниками Комиссариата, когда там будут работать серьезные и опытные работники. Нельзя играть в одну дудку с Облискомзапом, **нельзя**[X], воспевая интернационал в смысле Облискомзапа, **мечтать об устройстве судьбы Белоруссии**[XI] как национально-территориальной единицы.


Дэманстрацыя ў Маскве. 1918 год

Мы должны быть честными государственными деятелями, чтобы нас не обвинили в авантюризме и чтобы существование Белорусского Комиссариата не было, по существу, провокацией белорусской идеи. Необходимо войти в переговоры с Облискомзапом о совместной работе, что же касается поддержки съезда, то в ней я больше чем уверен. На чрезвычайной конференции в Петербурге было решено войти с ходатайством в Совет Народных Комиссаров о выяснении судьбы Белоруссии и, таким образом, предупредить решения предстоящего съезда. Сделать этого не удалось, и съезд может предупредить наши попытки, а потому мы должны принять меры, чтобы этот вопрос разрешился благополучно путем переговоров с Облискомзапом, причем в первую очередь должен быть разрешен в положительном смысле о переименовании названия Западной области в Белорусскую. Мое конкретное предложение следующее: не упраздняя общей работы Комиссариата, но расширяя ее, перенести главную деятельность в Белоруссию, не ограничиваясь открытием отделов Комиссариата, но и непосредственным вхождением в Облискомзап. Из всех речей мне ясно, что все мы сходимся на том, что нужно выйти из создавшегося тупика, что разрешению этого вопроса может в значительной мере помочь съезд своим отношением к поднимаемому нами вопросу, а потому я предлагаю конкретно разрешить следующие вопросы:

1. О посылке делегации на съезд Советов Зап[адной] обл[асти] 11-го с[его] м[есяца].
2. О позиции делегатов.
3. Формы соглашения.

Предложение тов. Канчера принимается, и председательствующий предлагает высказаться по намеченным вопросам.

1) О посылке делегации на съезд Советов Западной области 11-го с[его] м[есяца].

Признано необходимым послать на съезд активных работников официально от Комиссариата, в количестве трех человек.

Намечаются кандидаты: Лагун, Турук, Канчер, Жилунович и Петрович.

Избраны: Лагун, Турук и Канчер.

Секретарствование принимает тов. Семенович.

2) О позиции делегатов.

По данному вопросу высказываются следующие товарищи:

Тов. Червяков. Делегаты должны уяснить себе, для чего они поедут на съезд: для того ли, чтобы содействовать популяризации белорусской идеи путем выступлений от имени Комиссариата, или для того, чтобы требовать признания за Комиссариатом права решающего значения в делах Облискомзапа. Второе может быть лишь только в том случае, если у Комиссариата имеются в виду люди, способные занять ответственные посты в Облискомзапе. Я нахожу, что достаточно будет, если делегаты от Комиссариата добьются принципиального согласия на это съезда в виде соответствующей резолюции.

Тов. Турук. Указывает, что к Облискомзапу все центральные учреждения республики относятся, безусловно, отрицательно, а посему с этим обстоятельством должна согласовать свою линию поведения и посылаемая Комиссариатом делегация.

Тов. Петрович. Делегация должна настаивать на положительном разрешении съездом трех принципиальных вопросов: 1. Белоруссия должна быть широко автономной и существовать на основах федерации с РСФСР, в Белоруссии должны существовать свои белорусские Областной исполнительный комитет и Совнарком, власть которых должна распространяться как на неоккупированную, так и на оккупированную Белоруссию. 2. Делегация должна настаивать на переименовании Западной области в Белорусскую область. 3. Облискомзап в нынешнем его составе должен быть переизбран, после чего он будет в состоянии удовлетворять «и коммунистов, и белорусов». Если съезд признает за переизбранным Облискомзапом всю полноту власти как верховного органа Белоруссии, сам же Облискомзап будет удовлетворять нас как белорусов, а сама Западная область будет переименована в Белорусскую – Белнаком обязан будет прекратить свое существование. В противном случае необходимо, чтобы Белнаком существовал и выполнял бы все те задания, которые он выполняет в настоящий момент.

Тов. Турук. Указывает, что в данный момент все заявления представителей Облискомзапа о невозможности переименования Западной области в Белорусскую область, что, по мнению Облискомзапа, создаст прецедент к выступлению буржуазной Рады в сторону отложения[XII] от России, – отпадают в силу того соглашения о противодействии всяким отделениям окрайных областей от Российской Республики, которое состоялось на этих днях.

Тов. Канчер. Нам надо идти по пути сохранения Облискомзапа, ибо в противном случае неизбежна борьба. Мы должны сказать съехавшимся на съезд массам, что мы сохраняем юридическую природу организации (Облискомзапа), но требуем переизбрания ея состава. Такая тактика даст возможность прийти к безболезненному исходу борьбы.

[IX] Падкрэслена сінім алоўкам. На палях памета: Просматривается конечный взгляд на К[омисса]риат.
[X] Падкрэслена сінім алоўкам.
[XI] Падкрэслена сінім алоўкам.
[XII] Так у тэксце.

Тов. Турук. Указывает, что последнее предложение тов. Канчера создаст двойственность, даже двусмысленность положения Комиссариата. Необходимо поэтому идти только одной прямой дорогой: рассматривать данный вопрос под углом зрения как национальной, так и классовой борьбы.

Тов. Лагун. Присоединяется к мнению тов. Канчера и вносит предложение о переходе к обсуждению других вопросов, мотивируя свое предложение безусловной ясностью рассматриваемого вопроса.

Тов. Канчер. Указывает, что тактика, предлагаемая тов. Туруком, совершенно неприемлема ввиду голословности и недоказанности указаний тов. Турука на неустойчивость положения Облискомзапа.

**После исчерпания прений** по данному вопросу, **совещание утверждает позицию, выдвинутую тт. Канчером, Петровичем и Лагуном**[XIII].

3) Тов. Лагун. Для того чтобы было достигнуто соглашение с Облискомзапом, необходимо, чтобы съезд разрешил следующие вопросы, которые, в свою очередь, должны рассматривать и мы: 1. Западная область должна быть переименована в Белорусскую область. 2. Необходимо создать местный центр власти для Белоруссии. 3. Необходимо, чтобы Облискомзап раз и навсегда отказался от прежней своей тактики в отношении белорусского национального вопроса, необходима полнейшая свобода при проведении национальных принципов. 4. Облискомзап обязан прекратить гонение против отдельных белорусских деятелей и организаций и в дальнейшем не противодействовать той политике в области национального вопроса, которая проводится Советским Белорусским Комиссариатом.


Яўсей Канчар

Тов. Петрович. Предлагает обсудить вопрос о взаимоотношениях между Россией и Белоруссией, которые, по его мнению, должны базироваться на федерации Белоруссии с Российской Советской Республикой.

Тов. Канчер. Предлагает рассмотреть вопрос о Всебелорусском съезде.

Тов. Мазур. Предлагает включить для рассмотрения вопрос о Минской Раде и о формах власти в Белоруссии.

Вопросы, выдвинутые тт. Лагуном, Петровичем, Канчером и Мазуром, ставятся на рассмотрение совещания.

1. О переименовании Западной области в Белорусскую область.

Тов. Лагун. Находит, что шаги для разрешения этого вопроса должны вестись в двух направлениях: во-первых, необходимо аппелировать по этому вопросу к съезду и, во-вторых, вести переговоры и с самим Облискомзапом. **Позиция, занятая по этому вопросу тов. Лагуном, утверждается совещанием и предлагается делегации к руководству**[XIV].

2. О формах власти в Белоруссии.

Тов. Лагун. Находит, что Всебелорусский съезд Советов, созванный после освобождения Белоруссии от оккупации, должен сказать по этому поводу свое слово. По его мнению, этот вопрос может быть разрешен только следующим образом: Белоруссия должна существовать как автономная область на основах федерации с РСФСР. В Белоруссии должен существовать свой Совнарком, основанный, конечно, на принципах советской власти.

Тов. Петрович. Белоруссия должна быть вместе с Россией, но вместе с тем Белоруссия должна быть автономной, дабы сам народ белорусский участвовал бы в управлении областью.

Тов. Турук. Находит, что власть в Белоруссии должна являться по существу диктатурой белорусского пролетариата и беднейшего крестьянства. Все государственное устройство в Белоруссии и ея власть должны быть построены на основе Конституции РСФСР, утвержденной 5-м съездом Советов. Власть на территории Белоруссии будет находиться в руках пролетариата и крестьянства, органом которых, в свою очередь, будет являться областной исполнительный комитет Советов.

Об автономной Белорусской республике не может быть и речи.

Тов. Мазур. Присоединяется к мнению Турука.

Тов. Канчер. Не подлежит никакому сомнению, что никакая другая власть, кроме диктатуры пролетариата и беднейшего крестьянства, не мыслится нами для Белоруссии. Но мы должны стремиться к созданию только Белорусского Совета, состоящего из местных белорусских элементов, знающих край и нужды местного населения. Все же это выполнить без автономии Белоруссии невозможно, почему мы принципиально и должны признать, что в будущем Белоруссия должна существовать как автономная область, входящая в общую федерацию с РСФСР.

По исчерпании прений по данному вопросу вынесена следующая резолюция:

1) Организация власти в Белоруссии должна быть произведена на принципах Конституции, принятой 5-м Всероссийским съездом Советов.

2) Признать необходимым, чтобы местная советская власть конструировалась бы из местных элементов, знающих край и нужды местного населения.

3. О создании местного центра советской власти – Совета Белорусской области.

Не открывая прений по данному вопросу, совещание выносит следующую резолюцию: предлагается делегации всеми мерами поддерживать идею необходимости создания такого центра власти.

4. О прекращении преследования Облискомзапом отдельных белорусских деятелей и организаций.

Поручить делегации войти с Облискомзапом в переговоры о прекращении со стороны Облискомзапа систематических преследований белорусских деятелей и организаций, стоящих на платформе советской власти и примкнувших к революционно-национальному движению.

5. О Всебелорусском съезде.

Вследствие постановления совещания вопрос снят с очереди.

6. Вопрос о Национальном Белорусском Комиссариате.

Совещание по обсуждении данного вопроса вынесло следующую резолюцию: совещание признает существование Белорусского Национального Комиссариата при всех условиях важным и необходимым, а поэтому делегация на съезде данный вопрос не делает предметом обсуждения. Если же этот вопрос будет возбужден другой стороной, то совещание поручает делегации доказать съезду разницу в задачах национальных комиссариатов при центральной власти и белорусской власти в пределах Белорусской области.

---

XIII Падкрэслена ў тэксце.

XIV Падкрэслена ў тэксце.

7. О Минской Раде.

Совещание, не входя в прения по данному вопросу, вынесло следующую резолюцию: Рады не признавать, ни в какие взаимоотношения с нею не входить.

Тов. Петрович. Вносит предложение о рассмотрении в данном совещании вопроса о Представительстве при Главной германской квартире в гор. Минске. Предложение принимается.

8. О Представительстве в Минске при Главной германской квартире.

При обсуждении данного вопроса совещание вынесло следующую резолюцию: Представительство при Главной германской квартире в Минске организует Белорусский Национальный Комиссариат по особому ходатайству перед Наркомом по иностранным делам, о чем и поручается делегации довести до сведения съезда.

По исчерпании вопросов, поставленных на обсуждение, совещание закрывается в 4½ ч. дня.

Председатель совещания

Секретари совещания[XV].

**Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі.**
**Ф. Р-1318. Воп. 1. Спр. 83. Арк. 6–11 адв. Машынапіс.**

## Каментарыі

[1] Канчар Яўсей Сцяпанавіч (1882–1979). Пра яго жыццё і дзейнасць гл.: Скалабан В. Яўсей Канчар – палітык, гісторык, мемуарыст // Беларуская думка. – 2010. – № 1. – С. 88–91.

[2] Жылуновіч Зміцер Фёдаравіч (літаратурны псеўданім Цішка Гартны, 1887–1937), беларускі пісьменнік, грамадскі і дзяржаўны дзеяч. Акадэмік АН БССР (1928). У снежні 1917 года быў выбраны дэпутатам Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў ад Беларускай Сацыялістычнай Грамады. У 1918 годзе сакратар Белнацкама, рэдактар яго друкаванага органа – газеты «Дзянніца», загадчык выдавецкага аддзела. У кастрычніку 1918 года ўступіў у РКП(б). З 1 студзеня па 2 лютага 1919 года старшыня Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі, пазней палітработнік 14-й арміі і штаба Заходняга фронту. У 1920–1930-я гады ўзначальваў Дзяржаўнае выдавецтва БССР і Цэнтрархіў, працаваў намеснікам наркама асветы БССР, у Інстытуце гісторыі АН БССР. У 1936 годзе арыштаваны, у 1937 годзе памёр у Магілёўскай псіхіятрычнай лячэбніцы (паводле афіцыйнай версіі – ад гангрэны лёгкіх; паводле іншых крыніц – скончыў жыццё самагубствам).

[3] Пятровіч Іван Андрэевіч (літаратурны псеўданім Янка Нёманскі, 1890–1937), беларускі пісьменнік, эканаміст, грамадскі дзеяч. Акадэмік АН БССР (1928). У 1915–1916, 1918 гадах вучыўся на гісторыка-філалагічным факультэце Петраградскага ўніверсітэта. З 28 чэрвеня 1918 года ў партыі левых эсэраў. У 1918 годзе сакратар культурна-асветнага аддзела, загадчык выдавецкага аддзела Белнацкама, разам з З. Жылуновічам рэдагаваў газету «Дзянніца». У 1919–1920 гадах у Чырвонай арміі. З 1922 года ў Мінску, працаваў у планава-эканамічных органах, займаў пасаду вучонага сакратара Інстытута эканомікі АН БССР, намесніка старшыні Дзяржплана БССР. Член Інбелкульта. З 1931 года загадчык аддзела эканомікі НДІ прамысловасці. У 1932 годзе ўступіў у Камуністычную партыю, выключаны ў снежні 1935 года за «ўтойванне пры ўступленні ў ВКП(б) свайго знаходжання ў эсэраўскай арганізацыі». У 1937 годзе арыштаваны і расстраляны. У турме падрыхтаваў запіску па пытанні стварэння абласцей у БССР (гл.: Рублевская Л., Владимиров В. Камерное творчество «вредителей» // Советская Белоруссия. – 28 апреля 2010). У 1957 годзе Бюро ЦК КПБ адмовіла ў пасмяротнай рэабілітацыі І.А. Пятровіча ў партыйных адносінах.

[4] Чарвякоў Аляксандр Рыгоравіч (1892–1937), дзяржаўны дзеяч Беларусі. З мая 1917 года член бальшавіцкай партыі, восенню 1917 года адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, на аснове якой у красавіку 1918 года створана беларуская секцыя РКП(б) пры Пецяргофскім райкаме РКП(б) Петраграда. У лютым – маі 1918 года камісар Белнацкама. З ліпеня 1918 года камісар дывізіі, начальнік Усерасійскага бюро камісараў. У 1919 годзе член Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі па асвеце, намеснік наркама асветы Літоўска-Беларускай ССР, працаваў у палітаддзеле Заходняга фронту. У 1920 годзе старшыня Мінскага губернскага ваенрэўкама, Ваенрэўкама БССР. У 1920–1924 гадах старшыня ЦВК і СНК БССР. З 1922 года адзін са старшыняў ЦВК СССР. З 1924 года старшыня ЦВК БССР. У перыяд рэпрэсій скончыў жыццё самагубствам.



Зміцер Жылуновіч



Іван Пятровіч (Янка Нёманскі)

[5] Усціловіч (Усціновіч) Аляксандр Харытонавіч (1896–1937). У 1917 годзе працаваў чыгуначнікам на Пуцілаўскім заводзе ў Петраградзе. У верасні 1917 года намеснік старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. Удзельнік Кастрычніцкага паўстання, камандзір атрада. У снежні 1917 года член УЦВК. З лютага 1918 года памочнік загадчыка аддзела працы Белнацкама, адначасова камандзір камуністычнага атрада Петраградскага камітэта РКП(б). У ліпені 1918 года часова выконваючы абавязкі кіраўніка спраў Белнацкама, потым таварыш (намеснік) кіраўніка спраў, супрацоўнік Беларускага аддзела Камісарыята па справах нацыянальнасцей Саюза камун Паўночнай вобласці (Петраградскага аддзялення Белнацкама). Адзін з кіраўнікоў беларускіх секцый РКП(б). У пачатку 1919 года ваенны камісар Слонімскага павета. Пасля Грамадзянскай вайны на гаспадарчай рабоце ў Петраградзе. Рэпрэсіраваны. У 1973 годзе па хадайніцтву Беларускай Савецкай Энцыклапедыі рэабілітаваны Ленінградскім абкамам КПСС у партыйных адносінах.

[6] Лагун Іосіф Васільевіч (1894–1919). У 1917 годзе рабочы-металіст у Петраградзе, бальшавік. Восенню 1917 года член выканкама Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. З лютага 1918 года загадчык аддзела працы Белнацкама, з сакавіка 1918 года камісар Петраградскага аддзялення Беларускага нацыянальнага камісарыята. З ліпеня 1918 года загадчык Белнацкама. На першым з'ездзе Кампартыі Беларусі (Смаленск, снежань 1918 года) выбраны членам Цэнтральнага бюро. У сакавіку 1919 года старшыня Паліткамісіі савецкай інспекцыі, прадстаўнік ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі. У жніўні 1919 года ў палітаддзеле 8-й страл-

[XV] Подпісы адсутнічаюць.

ковай дывізіі. Паводле сведчання І.А. Пятровіча, загінуў у час Грамадзянскай вайны.

[7] Мазур Ігнат Мікалаевіч (1890–1958). Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1910), працаваў настаўнікам. З 1914 года ў арміі. Скончыў Віленскае ваеннае вучылішча (1916). Камандаваў узводам у адной з воінскіх часцей у Царыцыне. Член Царыцынскага Савета рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Са студзеня 1918 года настаўнік школы ў м. Свержань Мінскага павета. З вясны 1918 года ў Маскве, у жніўні таго ж года ўступіў у РКП(б). Быў супрацоўнікам культурна-асветнага аддзела Белнацкама. 30 снежня 1918 года прызначаны загадчыкам Белнацкама. У 1919 годзе служыў у Чырвонай арміі, быў параненьі. Скончыў Акадэмію камуністычнага выхавання ў Маскве (1923). З 1923 года ў Мінску, працаваў у Цэнтральным бюро юных піянераў, педагагічнай секцыі Інстытута беларускай культуры, быў загадчыкам вопытна-паказальнай школы пры Белпедтэхнікуме. З 1926 года загадчык Галоўнага ўпраўлення сацыяльнага выхавання Наркамасветы БССР. Паводле сведчання яго сына Усевалада, які працаваў дацэнтам Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК Кампартыі Беларусі, у 1936 годзе І.М. Мазур быў выключаны з партыі. Захаваліся дакументы, што ён быў выключаны за «ўтойванне сваёй сувязі з нацдэмамі і прасоўванне ў сваіх працах нацдэмаўскіх установак». Арыштаваны ў ноч на 23 чэрвеня 1941 года. Яму ўдалося пазбегнуць расстрэлу на Магілёўскай шашы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.



Беларускі нацыянальны камісарыят. 1918 год

[8] Яхімовіч Фёдар Аляксеевіч (1887–1959), вучоны ў галіне паталагічнай фізіялогіі. Доктар медыцынскіх навук (1945), прафесар (1946). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1948). У 1917 годзе намеснік старшыні губернскага Савета сялянскіх дэпутатаў Віленскай губерні, дэлегат Усерасійскай дэмакратычнай нарады. У 1918 годзе ў Маскве, левы эсэр, справавод агітацыйна-прапагандысцкага аддзела сялянскага аддзела УЦВК. 15 чэрвеня 1918 года рэкамендаваны загадчыкам аддзела вядомай эсэркай Аляксандрай Ізмайловіч на пасаду загадчыка бежанскага аддзела Белнацкама. З 1918 года вучыўся на гісторыка-філалагічным, потым на медыцынскім факультэце Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, які скончыў у 1923 годзе. Да 1958 года працаваў у Мінскім медыцынскім інстытуце.

[9] Клыш Пётр Герасімавіч (? – 27 сакавіка 1919 года), бежанец з Гродзенскай губерні, член РКП(б). У 1918 годзе сакратар, памочнік загадчыка, загадчык агітацыйна-палітычнага аддзела Белнацкама. Старшыня фракцыі камуністаў – супрацоўнікаў Белнацкама. 29 снежня 1918 года І.В. Сталін санкцыянаваў прызначэнне П.Г. Клыша кіраўніком спраў Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі (у рэшце рэшт на гэту пасаду быў прызначаны В.Г. Кнорын). Са студзеня 1919 года член Гродзенскага рэўкама. Паводле сведчання А.І. Луцкевіча, у Гродне быў вядомы як камуніст, меў псеўданім Карліб, арыштаваны палякамі і расстраляны.

[10] Русак Сямён Рыгоравіч (1888 – ?). Скончыў пачатковае народнае вучылішча. Да 1912 года быў настаўнікам народнай школы граматы, служыў на Петраградскай тэлефоннай станцыі. У 1918 годзе член Беларускай сацыялістычнай грамады. З лютага 1918 года супрацоўнік Белнацкама, экспедытар, сакратар выдавецкага аддзела.

[11] Блізнюк Іван Восіпавіч (1889 – ?). Нарадзіўся ў сяле Лозкі Барысаўскага павета. Чатыры семестры вучыўся на вячэрнім рабфаку. У 1911 годзе прызваны на ваенную службу. Потым працаваў у Галоўным артылерыйскім упраўленні пісарам. У кастрычніку 1918 года ўступіў у беларускую секцыю РКП(б) у Маскве. У 1918 годзе загадчык канцылярыі Белнацкама, намеснік камісара 9-га Полацкага Беларускага палка Заходняй стралковай дывізіі. У сакавіку 1919 года прызначаны сакратаром камісара 52-й дывізіі. У 1920-я гады кіраваў справаводствам у НКУС БССР.

[12] Семяновіч Мікалай Сцяпанавіч (1895 – ?). Нарадзіўся на тэрыторыі сучаснага Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Юрыст. З 1912 года сацыяліст-рэвалюцыянер (эсэр). У 1918 годзе левы эсэр, адзін з кіраўнікоў секцыі беларусаў пры ЦК партыі левых эсэраў. У лютым 1918 года запрошаны на пасаду сакратара юрыдычнага аддзела Белнацкама, потым стаў загадчыкам гэтага аддзела. 24 мая 1918 года прызначаны часова выконваючым абавязкі кіраўніка спраў Белнацкама. Падчас ліпеньскага (1918 года) мяцяжу левых эсэраў арыштаваны, звольнены з пасады. 29 ліпеня 1918 года прызначаны галоўным сакратаром калегіі Белнацкама. Звольнены з Белнацкама 26 лістапада 1918 года. Выкладаў у юрыдычных ВНУ Масквы. Яго пляменнік А.А. Семяновіч – доктар філалагічных навук, прафесар, працаваў у Мінскім педінстытуце.

[13] Турук Фёдар Фёдаравіч (1889–1960), беларускі гісторык і грамадскі дзеяч. У 1918 годзе загадчык культурна-асветнага аддзела Белнацкама, адзін з арганізатараў Беларускага народнага ўніверсітэта і Беларускага навуковага таварыства ў Маскве. 4 верасня 1918 года Белнацкам звярнуўся ў Мясніцкую надзвычайную камісію па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам з просьбай тэрмінова вызваліць Ф.Ф. Турука з-пад арышту і паручыўся за своечасовасць прыходу Турука ў распараджэнне следчых уладаў. З 1919 года Ф.Ф. Турук – загадчык Беларускага пададдзела аддзела асветы нацыянальных меншасцей Наркамата асветы РСФСР. Удзельнічаў у арганізацыі БДУ, з 1921 года яго прафесар. З 1923 года выкладчык Камуністычнага ўніверсітэта нацыянальных меншасцей Захаду ў Маскве, прафесар ВНУ Масквы. Ф.Ф. Туруку і яго дачцэ Ірыне прысвечана кніга Алеся Кажадуба «Призвание: учить. История профессорской династии» (Москва, 2006).

[14] Облискомзап (Областной исполнительный комитет Советов рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Западной области) – вышэйшы выканаўчы орган у 1917–1918 гадах Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў на тэрыторыі Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Смаленскай (з красавіка 1918 года) губерняў і Заходняга фронту.

[15] Гаворка, верагодна, пра Дэкрэт СНК РСФСР пра скліканне Паходнага круга Савецкага войска Данскога 3 верасня 1918 года.

[16] Рада, Мінская Рада – маюцца на ўвазе цэнтральныя органы Беларускай Народнай Рэспублікі – Рада БНР і Народны сакратарыят БНР.

**Прадмова, публікацыя і каментарыі В. СКАЛАБАНА**